# ГІСТОРЫЯ

УДК 947,6«1921/39»

***Віталь Пятровіч Гарматны***
*канд. гіст. навук, ст. навук. супрацоўнік*
*Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Vital Harmatny***
*Candidate of Historical Sciences, Senior Research Fellow of the Institute of History*
*of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: vitharmatny@mail.ru

## ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ДРАГІЧЫНСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА ў 1921–1939 гг.

*На сучасным этапе развіцця айчыннай гістарычнай навукі назіраецца актывізацыя ўвагі да вывучэння розных аспектаў гісторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Разам з тым для цэласнага разумення такога надзвычай супярэчлівага перыяду айчыннай гісторыі неабходна наблізіць разглядаемыя падзеі да простага чалавека і на ўзроўні асобных рэгіёнаў разгледзець іх уплыў на яго побыт і паўсядзённасць. У сувязі з гэтым у артыкуле паказана даследаванне сацыяльна-эканамічнага развіцця на прыкладзе Драгічынскага павета Палескага ваяводства.*

***Ключавыя словы:*** *сацыяльна-эканамічнае развіццё, Драгічынскі павет, сельская гаспадарка, прамысловасць, рамёствы.*

## *Historiographical Review of the Socio-Economic Development of the Dragichyn Powet of the Polesie Voivodeship in 1921–1939*

*At the current stage of the development of domestic historical science, active attention is being paid to the study of various aspects of the history of Western Belarus in 1921–1939. At the same time, for a comprehensive understanding of such an extremely controversial period of the country's history, it is necessary to bring the considered events closer to the common man and consider their impact on his life and everyday life at the level of individual regions. In connection with this, this article shows the study of socio-economic development on the example of Dragichyn powet, Poleskie Voivodeship.*

***Key words:*** *socio-economic development, Dragichyn powet, agriculture, industry, crafts.*

### Уводзіны

На працягу 1921–1939 гг. Драгічынскі павет з’яўляўся часткай Палескага ваяводства, якое ў народна-гаспадарчым комплексе міжваеннай Польшчы ацэньвалася як адносна адсталае ў сацыяльна-эканамічным плане, што, аднак, на сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі можна паставіць пад пытанне, улічваючы больш высокую мясцовую ўраджайнасць у параўнанні, напрыклад, з Навагрудскім. Нягледзячы на тое што па плошчы Драгічынскі павет быў самым маленькім у ваяводстве (на 1931 г. – 2 351 км$^2$, большая частка тэрыторыі сучасных Драгічынскага і Іванаўскага раёнаў), у параўнанні з іншымі паветамі характарызаваўся высокай заселенасцю: у 1921 г. згодна ўсеагульнага польскага перапісу сярэдняя шчыльнасць насельніцтва тут складала 26,8 чалавекі на 1 км$^2$ (па ваяводстве – 20,8), а ў 1931 г. – 41,3 (30,9) з насельніцтвам каля 97 000 чалавек [1, s. 17]. Гэтая тэма раскрываецца ў змястоўным артыкуле Ю. П. Максімовіча [2], дзе разглядаецца размяшчэнне насельніцтва, нацыянальны склад жыхароў і ўклад прадстаўнікоў розных этнічных груп у сацыяльна-эканамічнае развіццё тагачаснага Драгічынскага павета, выдзяляецца такі асобны этнаграфічны і гаспадарчы рэгіён, як «Загароддзе», які дзякуючы наяўнасці прыдатных для апрацоўкі глеб быў найбольш заселеным і квітнеючым.

### Ажыццяўленне даследавання

Яшчэ ў міжваенны перыяд С. Біскупскі аналізуючы становішча зямельнага рынку тагачаснага Палесся і асноўныя яго фактары, падкрэсліў, што Драгічынскі павет быў у ваяводстве адным з чатырох самаакупальных дзякуючы адносна высокай у параўнанні з агульнаваяводскай ураджайна-

сці мясцовых ворных зямель, і адзначыў, што далейшае паспяховае развіццё сельскай гаспадаркі было немагчыма без шырокага ажыццяўлення меліярацыі [3].

У нарысе Е. Незбжыцкага з вайскова-стратэгічных пазіцый прааналізавана становішча Палесся і Драгічыншчыны як яго часткі, вылучаны галоўныя паказчыкі размяшчэння насельніцтва, выкладзены асноўныя характарыстыкі транспартнай сеткі, мясцовых глеб і лясоў і ў сувязі з гэтым асаблівасці вядзення тут сельскай гаспадаркі, найперш за ўсё масавая забалочанасць і агульнае малазямелле [4].

Варта ўзгадаць, што на той час Палессе, акрамя адсталасці ў сацыяльна-эканамічным плане, было таксама паўсюдна вядома ў якасці турыстычна прыцягальнага рэгіёна, сведчаннем чаму з'яўляецца спецыяльны даведнік, падрыхтаваны М. Марчакам [5], з якога можна атрымаць грунтоўную інфармацыю пра мясцовыя славутасці (у тым ліку і Драгічыншчыны), а таксама неабходную ў сувязі з гэтым інфраструктуру.

Высокую навуковую каштоўнасць уяўляюць таксама ўспаміны мясцовага памешчыка Ф. Віславуха, дзякуючы чаму можна атрымаць цікавыя звесткі пра тагачасную паўсядзённасць Драгічыншчыны, умовы жыцця людзей, іх першасныя патрэбы, захапленні і інтарэсы, матэрыяльнае становішча і ўзаемаадносіны асноўных сацыяльных груп мясцовага насельніцтва, напрыклад, і пра прыгоды равіна з Хомска, які ў час польска-савецкай вайны выратаваў некалькі польскіх салдат, але з-за бюракратычных недарэчнасцяў замест узнагароды трапіў у выніку пад арышт [6].

Неабходна асабліва адзначыць першую комплексную працу, прысвечаную Палескаму ваяводству, польскага даследчыка Е. Тамашэўскага [7], у якой сярод іншага разглядаецца і сацыяльна-эканамічнае развіццё Драгічыншчыны, прыведзены розныя падрабязныя статыстычныя звесткі: гушчыня населенасці, паказчыкі наяўнасці памешчыцкага землеўладання, забалочанасці і г. д.

Справу Тамашэўскага на сучасным этапе працягнулі П. Ціхарацкі [8] і В. Сляшынскі [9], у працах якіх, у прыватнасці, прыведзены паказчыкі ўраджайнасці па палескіх паветах, наяўнасць свойскай жывёлы і сельскагаспадарчага інвентара, у тым ліку і на Драгічыншчыне.

Грунтоўнае даследаванне Я. Стабняк-Смагажэўскай прысвечана насаджэнню вайсковага асадніцтва [10], у якім прыведзены колькасныя звесткі адносна рэалізацыі гэтай палітыкі на Драгічыншчыне: колькасць асад і асаднікаў, а таксама плошча зямлі, якую ім тут перадалі і якая магла трапіць у рукі навакольных сялян. У цэлым асаднікі павінны былі забяспечыць палітычную лаяльнасць да польскага панавання ў мясцовага насельніцтва і стаць арыенцірам у справе рэарганізацыі асабістых гаспадарак на капіталістычны лад, але ў цэлым выканаць гэтыя задачы ў сілу рознага роду прычын ім удалося далёка не ў поўнай меры.

Сярод іншых прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі асобнай падзякі заслугоўвае З. Тамчонак [1], працы якой прысвечаны грамадска-палітычнаму руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, дзе таксама разглядаецца панесеныя падчас Першай сусветнай і польска-савецкай войн страты (у т. л. і на Драгічыншчыне), агульныя характарыстыкі і асаблівасці мясцовага насельніцтва, перш за ўсё яго матэрыяльнае становішча як перадумовы палітычных настрояў і актыўнасці.

Прадстаўнікамі айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду асноўная ўвага надавалася вывучэнню рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху заходнебеларускага насельніцтва ў барацьбе за свае жыццёвыя правы і інтарэсы (галоўным чынам дыскрымінацыйнай падатковай палітыкі) і ў цэлым супраць польскага панавання, таму аспекты сацыяльна-эканамічнага развіцця звычайна падаваліся фонам і, па сутнасці, не станавіліся прадметам асобнай работы. Сярод адносна рэдкіх выключэнняў у сувязі з гэтым неабходна станоўча адзначыць галоўным чынам даследаванні А. А. Сарокіна [11], Б. Я. Кухарава [12], І. В. і У. А. Палуянаў [13–15], у якіх прыведзены асобныя звесткі пра сацыяльна-эканамічнае развіццё Драгічыншчыны, напрыклад пра наяўнасць коней у асабістых сялянскіх гаспадарках, а таксама ўзгадваецца набыццё адным з бліжэйшых паплечнікаў Ю. Пілсудскага генералам Л. Жэлігоўскім больш 500 га на Драгічыншчыне ў рамках праграмы насаджэння асадніцтва.

З набыццём дзяржаўнай незалежнасці Беларусі айчынныя даследчыкі атрымалі магчымасць больш свабоднага выбару тэм для навуковага даследавання ў вывучэнні адзначанага храналагічнага перыяду. Увага перайшла ад гісторыка-партыйнай тэматыкі да сацыяльна-эканамічнай і, ў прыватнасці, пытанні паўсядзённасці, мікрагісторыі і становішча простага чалавека перад суровымі выпрабаваннямі гісторыі. Істотнай вехай у разглядзе адзначанай тэматыкі стала выданне серыі кніг «Памяць», прысвечаных асобным раёнам Беларусі, у т. л. Драгічынскаму і Іванаўскаму [16; 17], у якіх асветлены і міжваенны перыяд, у сціслым выглядзе паказаны эканамічная палітыка польскіх уладаў і матэрыяльны дабрабыт мясцовага насельніцтва. Разам з тым у адпаведнасці з папярэднімі падыходамі акцэнт зроблены на цяжкасці, падкрэсліваецца, што ў сувязі з невысокім агульным дабрабытам і частымі дэфіцытамі большасць неабходных у гаспадарцы тавараў насельніцтва вымушана было пераважна вырабляць іх самастойна.

Справа насаджэння асадніцтва знаходзіцца ў цэнтры навуковага даследавання А. Ф. Сцяпанавай [18], якая распавяла пра насаджэнне асаднікаў на землях Драгічыншчыны і іх актыўны ўдзел у сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна. Разам з тым, нягледзячы на надзвычай высокую падтрымку з боку польскіх уладаў, далёка не ўсе мясцовыя асаднікі змаглі адпаведным чынам арганізаваць сваю гаспадарку на новым месцы ў далёка не самых простых умовах, таму ў выніку абсалютная большасць з іх мела запазычанасці па банкаўскіх крэдытах.

На сучасным этапе асаблівай увагі заслугоўвае навуковая дзейнасць гродзенскай даследчыцы Г. Касяноўскай (Вайцешчык) [19; 20], у працах якой разгледжана сацыяльна-эканамічнае развіццё заходнебеларускіх мястэчак у 1921–1939 гг., у т. л. Драгічына, Моталя, Янава і Хомска, якія былі асяродкамі цывілізацыі ў наваколлі. Развіццё рамяства ў Драгічынскім павеце знайшло адлюстраванне ў артыкуле І. Нікіценкава [21], які распавёў пра мотальскія кажушкі, што здаўна заслужана высока цаніліся сярод навакольнага насельніцтва. Становішча прамысловасці і гандлю тагачаснай Драгічыншчыны разгледжана Л. Лаўрэнка [22; 23], якая ў першую чаргу адзначае наяўнасць тут некалькіх важных цэнтраў па вытворчасці даматканага палатна, якое паўсюдна карысталася заслужанай папулярнасцю з-за сваёй высокай якасці і зручнасці ў карыстанні, і перш за ўсё шырокавядомых бездзежскіх фартушкоў.

Высокай падзякі заслугоўвае грунтоўная праца па гісторыі Іванаўскага раёна ад старажытнасці да сучаснасці, падрыхтаваная супрацоўнікамі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, у якой на аснове шматлікіх навуковых прац і гістарычных крыніц, многія з якіх уведзены ў навуковы абарот упершыню, прасочваецца сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна: паказаны матэрыяльны дабрабыт асноўных груп тагачаснага насельніцтва, дыспрапорцыі ў развіцці памешчыцкіх і асабістых сялянскіх гаспадарак, што не магло не выклікаць сутнасных канфліктаў і непаразуменняў [24]. Акрамя таго, А. І. Пашковіч прааналізавала структуру тагачасных населеных пунктаў Іванаўшчыны і іх нацыянальны склад, што запаўняе істотны прабел у айчыннай гістарычнай навуцы [15]. Вялікую цікавасць уяўляе таксама яе артыкул, дзе прааналізаваны конкурсныя працы мясцовых вучняў, у адным з якіх паказана паўсядзённае жыццё простых жыхароў мястэчка Янава (Іванава), якія працягвалі захоўваць цесную сувязь з сельскай гаспадаркай і знаходзіліся, па сутнасці, на мяжы выжывання [26].

Сярод непасрэдна прысвечаных Драгічыншчыне прац неабходна падкрэсліць выкананы вучнямі Хомскай школы пад кіраўніцтвам мясцовага настаўніка гісторыі Л. Шыкулы нарыс па гісторыі Хомска [27], дзе на аснове шматлікіх крыніц і перш за ўсё сабраных успамінаў старажылаў паказаны разнастайныя старонкі гісторыі вёскі, перш за ўсё ўмовы жыцця мясцовага насельніцтва і іх матэрыяльнае становішча, наяўнасці свойскай жывёлы і ўзровень тэхнічнай забяспечанасці асабістых сялянскіх гаспадарак. У цэлым дзякуючы наяўнасці шматлікай яўрэйскай грамады Хомск у міжваенны час здолеў дасягнуць даволі высокага ўзроўню эканамічнага развіцця, што праяўлялася ў наяўнасці шматлікіх крам і крамак, дзе можна было купіць амаль любы тавар, а таксама ў наяўнасці шматлікіх працоўных месцаў для навакольнага насельніцтва і правядзенні тут электрычнасці на

паравыя млыны, дзякуючы чаму з’явілася асвятленне і на мясцовых вуліцах.

Асаблівая ўвага таксама надаецца гісторыі вёскі Моталь [28; 29], якая здаўна з’яўлялася важным адміністрацыйным і гаспадарчым цэнтрам, славілася ўмелымі рамеснікамі і майстрамі і па сённяшні дзень захоўвае сваю этнаграфічную прывабнасць і каларыт. Сведчаннем гэтаму з’яўляюцца працы мясцовых ураджэнцаў, у якіх аналізуецца міжваенны перыяд, паказана складанае матэрыяльнае становішча навакольных жыхароў і іх імкненне да лепшага жыцця і барацьбу за свае правы і інтарэсы.

Гісторыя невялікай вёскі Сіманавічы падрыхтавана яе ўраджэнцамі ў выглядзе асобнай кнігі [30], утрымлівае цікавы фактaлагічны матэрыял, дзякуючы якому, напрыклад, можна атрымаць цэласнае ўяўленне аб матэрыяльным дабрабыце мясцовага насельніцтва, яго традыцыях і звычаях у перыяд польскага панавання. Сур’ёзным якасным станоўчым момантам выдання можна назваць наяўнасць шматлікіх дапаможных інфарматыўных крыніц, перш за ўсё сканаў дакументаў, карт і фотаілюстрацый.

У гістарычным нарысе пад рэдакцыяй І. І. Якоўчыка разглядаецца гісторыя вёскі Закозель [31], у прыватнасці ажыццяўленне тут у міжваенны перыяд аграрных пераўтварэнняў і ўзаемаадносіны сялян з мясцовымі памешчыкамі, імкненне вяскоўцаў усімі сіламі набыць дастатковую колькасць зямлі дзеля таго, каб стаць у выніку самастойнымі гаспадарамі.

Шэраг прац, прысвечаных азначанаму пытанню, падрыхтаваны В. П. Гарматным [32–35]. Тут у многім упершыню на базе архіўных і статыстычных крыніц разглядаюцца многія раней недаследаваныя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, галоўным чынам становішча сельскай гаспадаркі і правядзенне польскімі ўладамі аграрных пераўтварэнняў (найперш камасацыі), матэрыяльны дабрабыт вяскоўцаў, становішча прамысловасці, а таксама нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва, мясцовыя ўзаемадносіны.

**Заключэнне**

У 1921–1939 гг. у сацыяльна-эканамічных адносінах Драгічынскі павет быў адным з самых развітых і густанаселеных у Палескім ваяводстве, але дадзенае пытанне разглядалася ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі даволі сцісла і фрагментарна і таму патрабуе больш дэталёвага вывучэння з улікам патрабаванняў сучаснай гістарычнай навукі. Асаблівай пашаны ў гэтым плане заслугоўвае дзейнасць краязнаўцаў, дзякуючы якім падрыхтаваны шматлікія гістарычныя нарысы, прысвечаныя асобным населеным пунктам Драгічынскага павета, у якіх на мікраўзроўні дэталёва і з выдатным веданнем умоў жыцця мясцовага насельніцтва міжваеннага перыяду паказана яго становішча, узаемаадносіны і супярэчнасці.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Tomczonek, Z. Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. – Bialystok : Wydaw. Politechniki Bialostockiej, 1996. – 246 s.

1. Максімовіч, Ю. П. Некаторыя асаблівасці размяшчэння насельніцтва ў Драгічынскім павеце / Ю. П. Максімовіч // Загароддзе-1 : матэрыялы Міждысцыплінар. навук. семінара па пытаннях даслед. Палесся, Мінск, 19 верас. 1997 г. – Мінск : БелІПК, 1999. – С. 32–33.

3. Biskupski, St. Ceny ziemi w województwie Poleskiem w latach 1924–1929 / St. Biskupski. – Warszawa : Wydaw. Min. Reform Rolnych, 1931. – 78 s.

4. Niezbrzycki, J. Polesie: opis wojskowo-geograficzny i studium terenu / J. Niezbrzycki. – Warszawa : Wojsk. Inst. Nauk.-Wydaw., 1930. – 455 s.

5. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Brześć nad Bugiem : Nakł. Oddz. Pol. T-wa Krajoznawczego, 1935. – 160 s.

6. Wysłouh, F. Echa Polesia / F. Wysłouch. – Łomianki : LTW, [2012?]. – 204 s.

7. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia : zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : PWN, 1963. – 208 s.

8. Cichoracki, P. Województwo Poleskie, 1921–1939: z dziejów politycznych / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW, 2014. – 477 s.

9. Śleszynski, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 335 s.

10. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe, 1920–1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa : Rytm, 2003. – 418 s.

11. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии. 1920–1939 гг. / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 201 с.

12. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск : Выш. шк., 1975. – 110 с.

13. Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 357 с.

14. Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – 220 с.

15. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И. В. Полуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.

16. Памяць. Драгічынскі раён : гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. С. А. Супрун. – Мінск : БелТА, 1997. – 572 с.

17. Памяць. Іванаўскі раён : гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. В. М. Туркевіч. – Мінск : БелТА, 2000. – 590 с.

18. Сцяпанава, А. Ф. Грамадска-палітычная дзейнасць асаднікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1920–1939 гг.) / А. Ф. Сцяпанава // Культура, наука, образование в современном мире : материалы V Междунар. научн. конф. – Гродно : ГГАУ, 2011. – С. 438–442.

19. Вайцешчык, Г. С. Арганізацыя аховы здароўя ў мястэчках Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / Г. С. Вайцешчык // IV Машеровские чтения : материалы Междунар. науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 28–29 окт. 2010 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ, 2010. – Т. 1. – С. 203–206.

20. Касяноўская, Г. Сістэма медыцынскага абслугоўвання насельніцтва мястэчак Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / Г. Касяноўская // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. – Пинск : ПолесГУ, 2022. – Вып. 6. – С. 271–276.

21. Никитенков, И. В. Народные ремесла и промыслы в экономике Полесского воеводства (1920–1939 гг.) / И. В. Никитенков // Беларусь і Польша ў XX стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах : зб. студэнц. навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2000 г. – Брэст : БрДУ, 2001. – С. 58–60.

22. Лавреенко, Л. В. Ремесла и промыслы жителей белорусского Западного Полесья в 20–30-е годы XX в. / Л. В. Лавреенко // Polesie – Rodopy : zeszyty Cyrylo-metodiańskie. – 2016. – № 5 – S. 196–201.

23. Лаўрэенка, Л. В. Развіццё рамяства і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях у 1921–1939 гадах / Л. В. Лаўрэенка // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – 2013. – № 1. – С. 77–82.

24. Города и районы Брестчины: история и современность. Ивановский район / под общ. ред. А. А. Горбацкого. – Брест : Брест. тип., 2017. – 839 с.

25. Пашкович, Е. И. Административно-территориальное устройство и социально-демографическая ситуация на землях Ивановского района в составе Польши в 1920-х гг. / Е. И. Пашкович // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя Эканоміка. Права. – 2014. – № 1. – С. 20–26.

26. Пашкович, Е. И. Краеведческие альманахи как источник по истории повседневности на Полесье в 30-е гг. XX в. / Е. И. Пашкович // Социокультурная жизнь: история повседневности : сб. материалов регион. науч.-практ. конф., Брест, 27 нояб. 2015 г. – Брест, 2016. – С. 121–129.

27. Шикула, Л. История деревни Хомск / Л. Шикула // Запісы Таварыства аматараў беларускай гісторыі імя Вацлава Ластоўскага. – Рыга, 2013. – Вып. 1. – С. 65–94.

28. Рамановіч, П. С. Мястэчка Моталь у палітычным, сацыяльна-эканамічным жыцці Пінскага Палесся: мінулае і сучаснасць / П. С. Рамановіч // Моўна-культурная прастора Берасцейшчыны : зб. навук. арт. – Брэст : БрДУ, 2010. – С. 159–164.

29. Стасевич, П. С. Вёска над Ясельдай : гіст.-краязн. нарыс / П. С. Стасевіч. – Мінск : Полымя, 1991. – 99 с.

30. Литвинко, С. А. Симоновичи. История одной полесской деревни / С. А. Литвинко, В. Д. Губаревич. – Брест : Брест. тип., 2020. – 211 с.

31. Яковчик, И. И. Закозель: земля и люди / И. И. Яковчик, И. И. Акинчиц, В. В. Зданович. – Барановичи : Укрупн. тип., 1999. – 83 с.

32. Гарматны, В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Системная трансформация общества: исторический опыт, современность, перспективы : сб. науч. тр. / Брест. гос. техн. ун-т. – Брест, 2013. – Вып. 10. – С. 36–40.

33. Гарматны, В. П. Развіццё аграрнай сферы Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та імя А. А. Куляшова. – 2023. – № 1. – С. 60–65.

34. Гарматны, В. П. Развіццё прамысловасці Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2023. – № 1. – С. 17–21.

35. Гарматны, В. П. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Иппокрена. – 2019. – № 2. – С. 196–203.

REFERENCES

1. Tomczonek, Z. Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. – Bialystok : Wydaw. Politechniki Bialostockiej, 1996. – 246 s.

2. Maksimovich, Yu. P. Niekatoryja asablivasci razmiashchennia nasiel’nictva u Drahichynskim paviecie / Yu. P. Maksimovich // Zaharoddzie-1 : materyjaly Mizhdyscyplinar. navuk. sieminara pa pytanniah daslied. Paliessia, Minsk, 19 vieras. 1997 h. – Minsk : BielIPK, 1999. – S. 32–33.

3. Biskupski, St. Ceny ziemi w województwie Poleskiem w latach 1924–1929 / St. Biskupski. – Warszawa : Wydaw. Min. Reform Rolnych, 1931. – 78 s.

4. Niezbrzycki, J. Polesie: opis wojskowo-geograficzny i studium terenu / J. Niezbrzycki. – Warszawa : Wojsk. Inst. Nauk.-Wydaw., 1930. – 455 s.

5. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Brześć nad Bugiem : Nakł. Oddz. Pol. T-wa Krajoznawczego, 1935. – 160 s.

6. Wysłouh, F. Echa Polesia / F. Wysłouch. – Łomianki : LTW, [2012?]. – 204 s.

7. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia : zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : PWN, 1963. – 208 s.

8. Cichoracki, P. Województwo Poleskie, 1921–1939: z dziejów politycznych / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW, 2014. – 477 s.

9. Śleszynski, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 335 s.

10. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe, 1920–1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa : Rytm, 2003. – 418 s.

11. Sorokin, A. A. Agrarnyj vopros v Zapadnoj Bielorussii. 1920–1939 gg. / A. A. Sorokin. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1968. – 201 s.

12. Kukhariev, B. Ye. Siel’skoje khoziajstvo Zapadnoj Bielorussii (1919–1939 gg.) / B. Ye. Kukharev. – Minsk : Vysh. shk., 1975. – 110 s.

13. Polujan, V. A. Rievoliucionno-diemokratichieskoje dvizhenije v Zapadnoj Bielorussii (1927–1939 gg.) / V. A. Polujan. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1978. – 357 s.

14. Polujan, V. A. Rievoliucionnoje i nacional’no-osvoboditiel’noje dvizhenije v Zapadnoj Bielorussii v 1920–1939 gg. / V. A. Polujan, I. V. Polujan. – Minsk : Gosizdat BSSR, 1962. – 220 s.

15. Polujan, I. V. Zapadnaja Bielorussija v pieriod ekonomichieskogo krizisa 1929–1933 gg. / I. V. Polujan. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1991. – 207 s.

16. Pamiac’. Drahichynski rajon : hist.-dakum. khroniki haradou i rajonau Bielarusi / uklad. S. A. Suprun. – Minsk : BielTA, 1997. – 572 s.

17. Pamiac’. Ivanauski rajon : hist.-dakum. khroniki haradou i rajonau Bielarusi / uklad. V. M. Turkievich. – Minsk : BielTA, 2000. – 590 s.

18. Sciapanava, A. F. Hramadska-palitychnaja dziejnasc’ asadnikau na terytoryi Zakhodniaj Bielarusi (1920–1939 hh.) / A. F. Sciapanava // Kul’tura, nauka, obrazovanije v sovriemiennom mirie : matierialy V Miezhdunar. nauchn. konf. – Grodno : GGAU, 2011. – S. 438–442.

19. Vajcieshchyk, H. S. Arganizacyja akhovy zdarouja u miastechkakh Palieskaha vajavodstva u 1921–1939 hh. / H. S. Vajcieshchyk // IV Masherovskije chtienija : matierialy Miezhdunar. nauch.-

prakt. konf. studientov, aspirantov i molodykh uchionykh, Vitiebsk, 28–29 okt. 2010 g. : v 2 t. – Vitiebsk : VGU, 2010. – T. 1. – S. 203–206.

20. Kasianouskaja, H. Sistema miedycynskaha absluhouvannia nasiel’nictva myistechak Zakhodniaj Bielarusi u 1921–1939 hh. / H. Kasianouskaja // Gosudarstva Central’noj i Vostochnoj Jevropy v istorichieskoj pierspiektivie : sb. nauch. st. – Pinsk : PoliesGU, 2022. – Vyp. 6. – S. 271–276.

21. Nikitienkov, I. V. Narodnyje riemiesla i promysly v ekonomikie Poliesskogo vojevodstva (1920–1939 gg.) / I. V. Nikitienkov // Bielarus’ i Pol’shcha u XX stahoddzi: ahul’naje i admietnaje u histarychnykh liosakh : zb. studenc. navuk.-prakt. kanf., Brest, 7–8 kras. 2000 h. – Brest : BrDU, 2001. – S. 58–60.

22. Lavriejenko, L. V. Riemiosla i promysly zhitieliej bielorusskogo Zapadnogo Polies’ja v 20–30-je gody XX v. / L. V. Lavriejenko // Polesie – Rodopy : zeszyty Cyrylo-metodiańskie. – 2016. – № 5 – S. 196–201.

23. Laurejenka, L. V. Razviccio ramiastva i ramiesnaj vytvorchasci na zakhodniebielaruskikh ziemliakh u 1921–1939 hadakh / L.V. Laurejenka // Viestn. Polock. gos. un-ta. – 2013. – № 1. – S. 77–82.

24. Goroda i rajony Briestchiny: istorija i sovriemiennost’. Ivanovskij rajon / pod shch. red. A. A. Gorbackogo. – Briest : Briest. tip., 2017. – 839 s.

25. Pashkovich, Ye. I. Administrativno-tierritorial’noje ustrojstvo i social’no-diemografichieskaja situacija na ziemliakh Ivanovskogo rajona v sostavie Pol’shi v 1920-kh gg. / Ye. I. Pashkovich // Viesn. Bresc. un-ta. Sier. 3, Historyja. Ekanomika. Prava. – 2014. – № 1. – S. 20–26.

26. Pashkovich, Ye. I. Krajeviedchieskije al’manakhi kak istochnik po istorii povsiednievnosti na Polies’je v 30-je gg. XX v. / Ye. I. Pashkovich // Sociokul’turnaja zhizn’: istorija povsiednievnosti : sb. matierialov riegion. nauch.-prakt. konf., Briest, 27 nojab. 2015 g. – Briest, 2016. – S. 121–129.

27. Shikula, L. Istorija dierievni Khomsk / L. Shikula // Zapisy Tavarystva amatarau bielaruskaj historyi imia Vaclava Lastouskaha. – Ryha, 2013. – Vyp. 1. – S. 65–94.

28. Ramanovich, P. S. Myastechka Motal’ u palitychnym, sacyjal’na-ekanamichnym zhycci Pinskaha Paliessia: minulaje i suchasnasc’ / P. S. Ramanovich // Movna-kul’turnaja prastora Bierasciejshchyny : zb. navuk. art. – Brest : BrDU, 2010. – S. 159–164.

29. Stasievich, P. S. Vioska nad Jasiel’daj : hist.-krajazn. narys / P. S. Stasievich. – Minsk : Polymia, 1991. – 99 s.

30. Litvinko, S. A. Simonovichi. Istorija odnoj poliesskoj dierievni / S. A. Litvinko, V. D. Gubarievich. – Briest : Briest. tip., 2020. – 211 s.

31. Jakovchik, I. I. Zakoziel’: ziemlia i liudi / I. I. Jakovchik, I. I. Akinchic, V. V. Zdanovich. – Baranovichi : Ukrupn. tip., 1999. – 83 s.

32. Harmatny, V. P. Praviadziennie kamasacyi na terytoryi Drahichynskaha pavieta Palieskaha vajavodstva u 1921–1939 hh. / V. P. Harmatny // Sistiemnaja transformacija obshchiestva: istorichieskij opyt, sovriemiennost’, pierspiektivy : sb. nauch. tr. / Briest. gos. tiekhn. un-t. – Briest, 2013. – Vyp. 10. – S. 36–40.

33. Harmatny, V. P. Razviccio ahrarnaj sfiery Drahchynskaha pavieta Palieskaha vajavodstva u 1921–1939 hh. / V. P. Harmatny // Viesn. Mahilious. dziarzh. un-ta imia A. A. Kuliashova. – 2023. – № 1. – S. 60–65.

34. Harmatny, V. P. Razviccio pramyslovasci Drahichynskaha pavieta Palieskaha vajavodstva u 1921–1939 hh. / V. P. Harmatny // Izv. Gomiel’s. gos. un-ta. – 2023. – № 1. – S. 17–21.

35. Harmatny, V. P. Sacyjal’na-ekanamichnaje razviccio Drahichynskaha pavieta Palieskaha vajavodstva u 1921–1939 hh. / V. P. Harmatny // Ippokriena. – 2019. – № 2. – S. 196–203.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 12.04.2024*